УДК 811.161.3(091)

# СТРУКТУРНА-СЭНСАВАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ЗАЧЫНУ Ў ЭПІСТАЛЯРЫЯХ Ф.С. КМІТЫ-ЧАРНАБЫЛЬСКАГА

***Д. А. Руклянскі*** (МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***М. В. Абабурка***,
д-р філал. навук, прафесар

Зачыны ў эпісталярыях могуць складацца як з аднаго, так і некалькіх сэнсавых блокаў (СБ). Кожны ліст пачынаецца са зваротнай канструкцыі з узмацняльнымі паўторамі тыпу *ясневельможный милостивы [антрапонім]*: *Ясневельможный милостивый пане троцки, пане а пане мой милостивый! (Л. 1)* Дадзеныя канструкцыі былі адзначаны ва ўсіх даследаваных лістах. Далей адным са сродкаў вербалізацыі ўступнай часткі з'яўляюцца ўстойлівыя канструкцыі з аналітычнымі формамі дзеясловаў тыпу *даю ведати / не мелом (не мялэм) чого писать / даю ведать в(ашей) п(анской) м(илости): Новин с краю тутошнего не мялэм чого вашей панской вельможности на тот час писать (Л. 3)* Сустракаюцца выпадкі, калі ў склад зачынаў уваходзяць і СБ са значэннем «чалабіцця»: *Только покорне чолом бью пану моему милостивому, так и во власной речи моей, покорне и ниско чолом бью пану моему милостивому (Л.3).* У выніку аналізу было высветлена, у залежнасці ад камунікацыйнай накіраванасці лістоў, акрамя абавязковых, стандартызаваных, элементаў (зваротных канструкцый), зачыны могуць мець і элементы факультатыўныя: асабістыя скаргі адрасанта, што не адносяцца да асноўнага інфармацыйнага пласта: *иж тот замок оршанский жадного опатреня на собе не мает яко у збудованю стен, так и в недостатку стрельбы, порохов и пушкаров, так*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*ку обороне ниц люду служебного, в недостатку жывностий (Л. 17);* яго пахвалы адрасатам, пажаданні ім добрага і шчаслівага ўладарства з элементамі сакралізацыі: *дай же, пане боже, абы в(аша) м(илость) на тых панствах над нами счастливе и фортунне з благословенством божиим пануючи нам хрестиянским паном быти рачил (Л. 12;* звесткі аб яго матэрыяльным становішчы: *иж мне с так далекого краю о посланцы частые для недостатку моего (Л. 13).* Такім чынам, факультатыўныя элементы прыдаюць эпісталам нестандартны характар і некаторую распаўсюджанасць у іх структурна-сэнсавай будове.

**Літаратура**

1. Помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці / склаў А.Ф. Коршунаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 248 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова